

**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу Астравецкай ЦБС**

**Складальнік:** М.Мацкела
**Камп'ютэрнае афармленне:** Г.Францкевіч
**Рэдактар:** В.Пінчук

Адрас г.п. Астравец
вул. Набярэжная
дом 6

Тэлефон: 8-015-91-21-0-90
Эл. почта:

Гозская сельская бібліятэка

Серыя "Яны прайшлі дарогамі вайны"

# Аляксандр Лявонцьевіч Роўда

## ветэран Вялікай Айчыннай вайны



2009

# Роўда Аляксандр Лявонцьевіч



Нарадзіўся ў 1920 годзе на Мядзельшчыне, ў в. Некасецк у сялянскай сям'і. Тут пачаў сваю педагагічную дзейнасць.

У 1944г. быў прызваны на фронт. Ваяваў у 36-м Віцебскім Чырвонасцяжным палку. Быў двойчы паранены. Другі раз 16 студзеня 1945г., калі да Перамогі заставалася зусім мала. За баявыя заслугі быў ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, якім вельмі даражыць.

Пасля вайны Аляксандр Лявонцьевіч працаваў настаўнікам у Свірскім, Ашмянскім раёнах. Педагагічны стаж яго складае 46 гадоў. Працаваў нават будучы на заслужаным адпачынку яшчэ 11 гадоў. За працоўныя заслугі ўзнагароджаны медалём "Ветэран працы".

Толькі Гозскай базавай школе ён аддаў больш 30 гадоў свайго жыцця. Прыходзілася выкладаць розныя дысцыпліны, але асноўная спецыяльнасць — хімік-біёлаг.

Разам з жонкай Ганнай Дзмітрыеўнай, якая ўсё жыццё працавала на ФАПе, выгадавалі траіх дзяцей. Сын Ігар і дачка Ганна, якая жыве ў г. Самара, таксама сталі педагогамі. Ігар увогуле магістр педагагічных навук. Яшчэ адна дачка Дзіна як і маці таксама звязала свой лёс з аховай здароўя, стала фармацэўтам, жыве і працуе ў Іўі, што на Гродзеншчыне.

Сёння Аляксандр Лявонцьевіч поўны жыццёвых сіл. Актыўна займаецца пчалярствам, даглядае вялізны сад і агарод.

